Алег ТРУСАЎ

# Віцебская архітэктурная школа XII ст. Гісторыя будаўнічай тэхнікі

*Віцебская архітэктурная школа склалася ў другой чвэрці XII ст. Яе адметная рыса — дэкаратыўная мяшаная муроўка, якая рабілася з абчасаных і падагнаных каменных блокаў, шэрагі якіх аддзяляліся адзін ад аднаго двума шэрагамі плінфы. Храмы аздабляў фрэскавы роспіс. Спалучэнне абчасаных каменных блокаў і плінфы ўласціва для дойлідства Візантыі. Існуе меркаванне, што менавіта візантыйскі дойлід заснаваў у Беларусі самабытную архітэктурную школу.*

Віцебская архітэктурная школа склалася ў другой чвэрці XII ст. Да яе адносяцца Дабравешчанская царква ў Віцебску і Барысаглебская царква ў Навагрудку. Магчыма, што храмы гэтай архітэктурнай школы існавалі таксама на Верхнім замку Віцебска, дзе знойдзеныя плінфы, смальта для мазаік і некалькі невялікіх плітак падлогі, і на слуцкім дзядзінцы, дзе археолагі выявілі фрагменты каменных блокаў і плінфу (гэтыя будаўнічыя матэрыялы ідэнтычныя ў тым, што выкарыстоўваліся пры ўзвядзенні Дабравешчанскай царквы).

Першым даследчыкам, які звярнуў увагу на ўнікальную муроўку Віцебскай Дабравешчанскай царквы ў XIX ст., быў расійскі гісторык Андрэй Паўлінаў, які зрабіў на гэтую тэму даклад на IX Археалагічным з'ездзе Расійскай Імперыі, што адбыўся ў жніўні 1893 г. у Вільні[1]. Другім даследчыкам, які правёў дэтальнае вывучэнне муроў Дабравешчанскай царквы, стаў беларускі мастацтвазнаўца Мікалай Шчакаціхін. Ён выявіў, што муроўка храма вельмі падобная да візантыйскіх узораў[2]. Пазней царкву вывучалі даследчыкі Іван Хозераў, Пётр Бараноўскі, Георгій Штыхаў, Міхаіл Каргер, Павел Рапапорт і аўтар артыкула.

Дабравешчанская царква была ўзведзена на левым беразе Заходняй Дзвіны на тэрыторыі гарадскога пасада Віцебска. Яна ўяўляла сабой выцягнутую трохнефавую шасціслуповую пабудову, што мела адну паўкруглую апсіду і дзве паўкруглыя нішы ў тоўшчы ўсходняй сцяны. Шырыня храма складала 11,1 м, даўжыня без апсіды — 18,2 м, з апсідай — 21 м. У заходняй сцяне (таўшчыня каля 1,5 м) размяшчалася лесвіца, якая вяла на хоры. Таўшчыня астатніх сцен была каля 1,1 м. Фасады і інтэр'еры царквы былі ўпрыгожаныя плоскімі аднапрыступкавымі лапаткамі (шырыня вонкавых лапатак 0,8 м). Апсіду аздаблялі плоскія вертыкальныя цягі.

Муры Дабравешчанскай царквы былі складзеныя з добра абчасаных і падагнаных каменных блокаў, шэрагі якіх аддзяляліся адзін ад аднаго двума шэрагамі плінфы. Звонку фасады былі атынкаваныя тон-



***ТРУСАЎ Алег Анатольевіч.***

*Дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (БДУКіМ), кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1954 г. у Мсціславе. У 1976 г. закончыў гістарычны факультэт БДУ, у 1980 г. — аспірантуру Інстытута гісторыі АН БССР. У 1981 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму "Археалагічнае вывучэнне помнікаў манументальнага дойлідства XI—XVII стст. на тэрыторыі Беларусі (метадычныя даследаванні)". У 1976—1992 гг. працаваў у Беларускім рэстаўрацыйным праектным інстытуце: археолагам, загадчыкам аддзела археалогіі. У 1990—1996 гг. — дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, з 1992 па 1995 г. — намеснік старшыні камісіі па культуры, адукацыі і захаванні гістарычнай спадчыны. З 1995 г. працуе ў БДУКіМ. У 1999—2017 гг. — старшыня Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны. Даследуе архітэктуру і матэрыяльную культуру Беларусі XI—XVIII ст. (гісторыю будаўнічай тэхнікі). Аўтар больш за 200 навуковых публікацый, аўтар і суаўтар 12 кніг. Сярод іх: "Памятники монументального зодчества Белоруссии XI–XVII вв. Архитектурно-археологический анализ" (Мн., 1988); "Старонкі мураванай кнігі" (Мн., 1990); "Старажытны Мсціслаў" (Мн., 1992, у суаўтарстве з М.А.Ткачовым); "Манументальнае дойлідства Беларусі XI—XVIII стагоддзяў. Гісторыя будаўнічай тэхнікі" (Мн., 2001); "Магілёўская ратуша. Гістарычны лёс і адраджэнне" (у суаўтарстве з А.Р.Агеевым) (Магілёў, 2010); "Кароткая гісторыя архітэктуры Беларусі" (Мн., 2015); "Гісторыя сярэднявечнай Еўропы" (Мн., 2016), "Гісторыя Расіі. Ад Сярэднявечча да сучаснасці" (у суаўтарстве. Мн., 2018).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кім пластом тынкоўкі-заціркі, потым іх паверхня дзялілася белымі вапнавымі палоскамі (таўшчынёй каля 1,5 см) на русты адпаведна памерам каменных блокаў. Мы прапанавалі назваць такі тып муроўкі дэкаратыўнай мяшанай. Такі ж прыём, але крыху зменены, назіраецца ў архітэктуры іншых земляў Кіеўскай Русі. Так, напрыклад, паверхня фасадаў Ільінскай царквы ў Чарнігаве, пабудаванай з плінфы, была аформленая тонкай тынкоўкай жоўта-ружовага колеру, па якой палоскамі белай вапнавай рошчыны зроблены падзел вонкавай паверхні сценаў на русты пад каменную муроўку[3]. Адпаведныя аналогіі гэтай муроўкі можна знайсці ў візантыйскім правінцыйным дойлідстве XII ст. У якасці прыкладу прывядзём муроўку сцен царквы з Тырнава (Балгарыя)[4].

Сярэднія памеры плінфы, з якой была зробленая Дабравешчанская царква ў Віцебску, наступныя — 28x19,5x3,35 см. Гэтая цэгла больш тонкая і вузкая за плінфу з большасці полацкіх храмаў (акрамя Пятніцкай царквы), што сведчыць пра іншаземнае паходжанне дойліда, які пабудаваў віцебскі храм[5]. На некаторых плінфах меліся знакі, меткі і клеймы. Цікавы знак на пасцелі адной з цаглін знайшоў падчас раскопак царквы савецкі гісторык архітэктуры Міхаіл Каргер. Гэты знак уяўляе сабой вялікі квадрат, да якога па кутах дапасаваныя чатыры маленькія квадрацікі. На тарцы іншай плінфы Каргер адзначыў цікавую метку, якая нагадвае нейкі надпіс[6]. На пасцелях плінфы рознымі даследчыкамі былі зафіксаваныя клеймы.

Каменныя блокі (квадры), з якіх былі складзеныя сцены Дабравешчанскай царквы, мелі розныя памеры. Вышыня некаторых блокаў у асноўным 20—24 см, але былі і меншыя квадры — вышынёй 7-8 см. Плінфа таксама мела розныя памеры. Так, савецкі гісторык архітэктуры Павел Рапапорт паведамляе, што яе памер у асноўным сягаў да 3,5x20-21x29—33 см, але былі і большыя цагліны — 6x27x30 см. Для скляпенняў выкарыстоўваліся больш вузкія экзэмпляры — шырынёй 11-12 і 15-16 см пры даўжыні 22—24 см. Была выяўленая і лякальная плінфа, што мела форму трохкутніка. Яе выкарыстоўвалі пры муроўцы ваконных праёмаў[7]. Рошчына для муроўкі рабілася з вапны, з дробным пяском, без дамешкі цамянкі. Царква мела фрэскавую размалёўку.

У выніку раскопак у 1982 г. аўтарам устаноўлена, што падлога храма была складзеная з невялікіх часаных камянёў, яе ўзровень падняты на 105 см вышэй за цокаль будынка. Верхняя паверхня камянёў падлогі (а гэта вялікія пліты няправільнай формы) старанна апрацаваная, і яны пакладзеныя гарызантальна. Прастора паміж імі запоўнена рошчынай. Глыбіня падмурка царквы 1,5 м. Мы таксама прасачылі рэшткі стужкавых падмуркаў паміж слупамі царквы. Пад падлогаю на глыбіню 1 м ішоў пласт вапнавай рошчыны з дамешкай дробных камянёў, а пад ім — чорны культурны пласт таўшчынёй 40—60 см з кера-




*План Дабравешчанскай царквы, складзены Г.В.Штыхавым паводле абмераў П.Д.Бараноўскага.*

мікай XI — першай чвэрці XII ст. І толькі падмурак апсіды заглыбляўся ў мацярык на 40 см. Такім чынам, падмурак царквы складаўся з камянёў на вапнавай рошчыне, праходзіў праз культурны пласт і быў урэзаны ў мацярык.

У 1964 г. беларускі археолаг Георгій Штыхаў прасачыў рэшткі прытвора каля паўднёвага партала храма, а М.Каргер у 1968 г. знайшоў рэшткі другога прытвора каля паўночнага партала. У сваёй справаздачы за 1964 г. Г.Штыхаў паведамляе, што на яго раскопках некалькі дзён прысутнічаў савецкі архітэктар і рэстаўратар Пётр Бараноўскі, які засведчыў, што лінія старажытнай падлогі храма была толькі на 20—30 см ніжэй за тагачасную дзённую паверхню. Яна вызначалася тым, што ў сцяне праходзіў ніжні канал драўляных сувязяў, які ішоў таксама ад сцяны да слупа храма, таму лінія падлогі не магла быць ніжэй за гэты канал. Муроўка сцен была ніжэй за ўзровень падлогі на канале. Самы першы рад абчасаных камянёў, што ўзвышаўся над падмуркам, выступаў на 10 см ад паверхні сцяны.

Пасярод заліўкі падмурка ішла чорная палоска вапны з цамянкай таўшчынёй 15—20 см, так званы "сезонны рад", паводле вызначэння беларускага гісторыка архітэктуры Івана Хозерава. Ён рабіўся звычайна падчас часовай кансервацыі недабудаваных муроў храма на зімовы перыяд. Таму можна сцвярджаць, што паміж будоўляй падмурка і сценаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



*Старажытная муроўка паўднёвага фасада Дабравешчанскай царквы (паводле П.Д.Бараноўскага).*




*Замалёўка плінфы і знакаў на ёй.*
Раскопкі Дабравешчанскай царквы Г.В.Штыхава.

быў перапынак. Тым больш што рошчына заліўкі адрозніваецца ад рошчыны сцен. Па просьбе П.Бараноўскага Г.Штыхаў крыху расчысціў руіны царквы, сабраў плінфу са знакамі і паставіў ахоўную шыльду. Даследчыкі прасачылі ў паўднёвай сцяне храма каналы ад драўляных сувязяў. Адлегласць паміж імі роўная 2,3 м[8].

Нашыя раскопкі пацвердзілі папярэднія публікацыі даследчыкаў адносна існавання старажытных прытвораў у Дабравешчанскай царкве. Тэхніка закладкі іх падмуркаў была такая самая, як і ў асноўнага аб'ёму храма. Іх шырыня складала каля 70 см, а глыбіня — каля 80 см. Знайсці рэшткі заходняга прытвора мы не здолелі, бо да старажытнага мура ўшчыльную прыбудаваныя больш позція цагляныя склепы.

Віцебскую Дабравешчанскую царкву таксама вывучаў Іван Хозераў. Ён лічыў, што ў яе будаўніцтве бралі ўдзел грэчаскія майстры. Даследчык адзначае, што на плінфе гэтага храма ёсць знакі і клеймы, а рошчына мае дамешкі дробнай цамянкі. Таўшчыня швоў у муроўцы сцен — 4—4,5 см. Пілястры звонку і ўнутры царквы аднаабломныя. Апсіда мела пас з вузкіх прамых паўкалонак. У 1926 г. І.Хозераў зрабіў зандаж у памяшканні прафезіса і выявіў наяўнасць фермы. Таксама даследчык расчысціў некалькі фрэсак. Ён лічыў, што ў Віцебску былі чатырохслуповыя храмы прыходскага тыпу і заклікаў археолагаў іх шукаць[9].

На жаль, у 1944 г. верхнія часткі царквы, перарobленыя ў XVII—XIX стст., былі разбураныя, але руіны XII ст. добра захаваліся. У гэтым жа годзе іх абследаваў П.Бараноўскі, які зрабіў абмеры будынка. Вынікі гэтых даследаванняў апублікаваў пазней П.Рапапорт. Агульны памер будынка быў 21х11 м. У паўночнай частцы сцяны меўся ўваход на лесвіцу, што праходзіла ў тоўшчы сцяны. Хоры, паводле чарцяжа П.Бараноўскага, былі над нартэксам і мелі бакавыя каплічкі з апсідамі ў тоўшчы ўсходняй сцяны будынка. Іх скляпенні былі цыліндрычныя, з вялікімі распалубкамі, і абапіраліся на каменныя кранштэйны. Слупы храма, крыжападобныя ў плане, мелі памер 1,4 м. На знешніх і ўнутраных сценах храма ім адпавядалі плоскія лапаткі: унутраная шырынёй 90 см, а знешнія — 80 см. У 1944 г. старажытная муроўка храма захавалася да ўзроўню аркавых перамычак вокнаў другога яруса.

Вокны царквы былі вузкія і высокія. Іх шырыня — каля 30 см. Вышыня вокнаў першага яруса — 143 см, а другога — 170 см. Уверсе вокны мелі аркавыя перамычкі. Звонку і ўнутры вокны мелі шырокія адхоны, і таму іх шырыня з боку фасада дасягала амаль 90 см. У сярэдніх частках вокнаў П.Бараноўскі прасачыў шчыліны ад закладзеных у муроўку драўляных ваканіц, а ў адным з вокнаў меліся рэшткі дубовай ваканіцы таўшчынёй каля 3 см.

У сценах царквы Бараноўскі прасачыў адтуліны ад будаўнічых рыштаванняў. Яны былі скразныя, пераважна квадратныя, памерам ад 11х11 да 22х22 см, і

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

знаходзіліся ў шэрагах каменных квадраў, звычайна на вышыні такога шэрагу. Ніжні шэраг адтулін рыштаванняў знаходзіцца на вышыні 1,6 м ад паверхні зямлі, а вышэй адлегласць паміж шэрагамі насцілаў роўная прыкладна 1,4 м. Адлегласць паміж адтулінамі рыштаванняў па гарызанталі роўная каля 2,2 м. Таксама П.Бараноўскі прасачыў у сценах храма два ярусы драўляных сувязяў. Прычым ніжні ярус прахо-





*Фрагменты муроўкі Дабравешчанскай царквы.*
Фота Г.Штыхава. 1964 г.

дзіў ніжэй за падлогу і злучаў сцены са слупамі, і, такім чынам, быў створаны суцэльны каркас будынка.

Слушнае меркаванне І.Хозерава пра тое, што ў Віцебску былі і іншыя каменныя храмы XII ст., пацвердзілі археолагі. Яшчэ віцебскі даследчык Аляксей Сапуноў паведамляў, што ў 1895—1896 гг., падчас раскопак на Замкавай гары, знайшлі рэшткі падмурка і ніжні паверх будынка, які захаваўся да паловы ваконнага праёма, каменныя прыступкі і падлогу, выкладзеную керамічнымі пліткамі і каменнем.

У 1964 г., падчас земляных работ на Верхнім замку каля паўночнай сцяны Віцебскага пeдінстытута, мясцовы краязнавец М.Рыўкін прасачыў муроўку з плінфы на цамянцы. Цэлую плінфу з гэтага месца М.Рыўкін перадаў у Віцебскі абласны краязнаўчы музей. Фармат плінфы быў блізкі да квадрата.

Пліткі падлогі, смальта і ваконнае шкло, а таксама плінфа і вапняковыя пліты былі знойдзеныя падчас раскопак Верхняга замка ў 1978—1988 гг. Міхасём Ткачовым і Леанідам Калядзінскім. Плінфа мела таўшчыню 3,7 см. Вапняковыя пліты — 3—3,5 см. Іх верхнія і ніжнія грані былі счасаныя. Пліткі падлогі зробленыя ў драўлянай форме з тлустай чырвонай гліны. Форма плітак розная. Стрэлавідна-рамбічныя пліткі падлогі мелі даўжыню 11—11,5 см і шырыню ў рамбічнай частцы 7,5 см, а ў вузкай — 4 см. Пліткі трохкутнай формы мелі шырыню бакоў 7,5 см. Таўшчыня плітак — 2,3 см. Бакавыя грані плітак сколатыя і на іх захавалася рошчына. Аналагічная па складзе рошчына выкарыстоўвалася ў муроўцы Дабравешчанскай царквы. Знойдзеныя кавалкі круглага ваконнага шкла таўшчынёй 1,1 мм зеленаватага колеру.



*Фрагменты муроўкі Дабравешчанскай царквы.*
Фота А.Трусава. 1982 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Смальта, знойдзеная ў Віцебску, уяўляе сабой кубік даўжынёй 9 мм, шырынёй 8,7—7 мм (са схіламі да асновы) і вышынёй 8,5 см. Вага кубіка 1,1 г. Смальта зробленая з бясколернага празрыстага шкла. На верхнюю грань кубіка пакладзеная пазалота.

Археолагі знайшлі таксама дэталь ад даху царквы — трохгранны стрыжань даўжынёй 19 см, памерамі ў сячэнні 1,5х1,5 см і вагой 227 г, а таксама аплаўлены кавалак металічнага ліста, са сплаву волава і свінца[10].

Даследчык старажытнага Віцебска Л.Калядзінскі лічыць, што ў 1130—1140-я гг. горад належаў хутчэй за ўсё Васільку Святаславічу, унуку полацкага Усяслава Брачыславіча. У сярэдзіне 1140-х гг. чарнігаўскі князь Святаслаў Усеваладавіч ажаніўся з дачкой Васількі, таму ў Віцебск для будоўлі храмаў маглі прыехаць майстры з Чарнігава. Даследчык адзначае, што храм Святога Міхаіла на дзядзінцы быў пабудаваны ў тэхніцы змяшанай муроўкі: плінфы і вапняковыя пліты. Падлога храма магла ўяўляць сабой маляўнічую кампазіцыю з жоўтых і зялёных палосаў, выкладзеных з керамічных паліваных плітак стрэлападобнай формы ў аблямоўцы з плітак трохкутнай формы. Алтар храма быў аздоблены залачонай мазаікай. Цьмяна-шэрыя цынкавыя пласціны купала храма кантраставалі з бел-чырвона-белымі радамі плінфы і вапняковых плітаў. На думку Л.Калядзінскага, гэта быў патранальны храм на княжацкім двары, які мог быць разбураны ў 1393 г. падчас гарматнага абстрэлу Віцебскага замка князем Вітаўтам[11].

Ёсць меркаванне, што ў Віцебску ў XII ст. існавала яшчэ адна мураваная царква, якая знаходзілася на ўскрайку горада на беразе Заходняй Дзвіны, пад назвай Барысаглебская. Яна згадваецца ў адным з інвентароў (1552 г.) як існуючая *"з даўніх часоў"*[12]. Захаваліся малюнкі гэтага храма перад яго разбурэннем у канцы XIX ст. Даследчыкі адзначаюць, што царква ў плане падобная да будынкаў полацкай архітэктурнай школы XII ст. Магчыма, гэтая царква знаходзілася на тэрыторыі рэзідэнцыі віцебскіх князёў.

Цікава, што храм у Навагрудку, асноўны аб'ём якога пабудавалі віцебскія майстры, таксама называецца Барысаглебскім. Дзякуючы даследаванням М.Каргера, зробленым ім у 1961—1962 і 1965 гг., устаноўлена, што сённяшняя моцна перабудаваная царква Барыса і Глеба стаіць часткова на падмурках храма XII ст. Аўтар прадоўжыў даследаванні гэтага храма ў 1988 г.

Сцены Барысаглебскай царквы XII ст. былі складзеныя з вапняковых (туфавых) блокаў з нязначнымі ўстаўкамі плінфы, а вонкавая галерэя, якая з трох бакоў абкружала трохапсідны храм, — толькі з плінфы ў тэхніцы "муроўка са схаваным радам", характэрнай для Полацкай архітэктурнай школы XII ст. Храм быў размаляваны фрэскамі, меў умураваныя галаснікі, керамічную падлогу з рознакаляровых маёлікавых плітак квадратнай, прамавугольнай і трохвугольнай формы. Фрагмент сцяны старажытнага храма стаў часткай падмурка царквы XVI ст.

Царква XII ст. таксама мела тры прытворы. Падмуркі храма зробленыя з невялікіх камянёў без рошчыны і залягаюць на глыбіню 75—80 см. Яны прарэзаюць культурны пласт XI—XII стст. таўшчынёй 70 см і даходзяць да мацерыковага суглінку[13].

На тэрыторыі Слуцка ў XII ст. таксама існаваў храм, зроблены віцебскімі дойлідамі, бо там археолаг Л. Калядзінскі знайшоў кавалкі плінфы і каменныя блокі аналагічныя віцебскім. Даследчык датуе храм другой паловай XII ст.[14].

Такім чынам, існаванне на тэрыторыі Беларусі ў XII ст. самастойнай Віцебскай архітэктурнай школы не выклікае ніякага сумнення.

---

[1] Трусаў А. Даследаванні будаўнічых канструкцый і будаўнічых матэрыялаў мураванага дойлідства Беларусі ў XVIII — першай палове XX ст. // Беларускі гістарычны часопіс. 2018. № 2. С. 14.

[2] Шчакаціхін М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. Мінск, 1993. С. 114.

[3] Холостенко Н. В. Ильинская церковь в Чернигове по исследованиям 1964—1965 годов // Древнерусское искусство. Москва, 1972. С. 92.

[4] Царэвград. Търнов. Дворецът на българскитэ царэ прозртората Българска държава. София, 1973. Т. 1. Обр. 10.

[5] Трусаў А. Гісторыя беларускай цэглы // Беларускі гістарычны часопіс. 2017. № 11. С. 8.

[6] Трусов О.А. Памятники монументального зодчества Белоруссии XI—XVII вв.: Архитектурно-археологический анализ. Минск, 1988. С. 115.

[7] Раппопорт П.А. Церковь Благовещения в Витебске // Памятники культуры. Новые открытия. Ежегодник. Москва, 1987. С. 524.

[8] Штыхов Г.В. Отчет о раскопках в Витебске и археологических разведках в Полоцке в 1964 г. // ФАНД ЦНА НАН Беларусі. Спр № 243. С. 10-11, 16.

[9] Хозеров И.М. Белорусское и смоленское зодчество XI—XIII вв. Минск, 1994. С. 84—86.

[10] Калядзінскі Л.У. Віцебскі храм св. Міхаіла // Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя грамадскіх навук. 1995. № 1. С. 59—65.

[11] Калядзінскі Л. "Витебск — три стены каменные" // Беларускі гістарычны часопіс. 1995. № 2. С. 31, 34-35, 39.

[12] Боровой Р.В., Булкин В.А. Из истории церкви Бориса и Глеба в Витебске // Проблема изучения древнерусского зодчества (по материалам архитектурно-археологических чтений, посвящённых памяти П.А.Раппопорта, 15—19 января 1990 г.). Санкт-Петербург, 1996. С. 67-68.

[13] Трусов О.А. Борисоглебская церковь XII в. из Новогрудка // Памятники старины: Концепции. Открытия. Версии. Т. II. Санкт-Петербург — Псков, 1997. С. 353.

[14] Калядзінскі Л.У. Слуцк // Археалогія Беларусі. Энцыклапедыя. Т. II. Мінск, 2011. С. 304.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ірына ГАНЕЦКАЯ

# Даследаванне новага помніка на тэрыторыі замкавага комплексу ў Міры

*Мірскі замак з'яўляецца адным з самых вядомых помнікаў архітэктуры і турыстычных аб'ектаў Беларусі. Яго старажытныя муры і змястоўная экспазіцыя Музея "Замкавы комплекс "Мір" прадстаўляюць гісторыю замка і яго ўладальнікаў. Аднак многія яе старонкі адкрываюцца толькі цяпер, часам абсалютна нечакана. Падчас археалагічных раскопак 2016–2018 гадоў на тэрыторыі замкавага комплексу намі быў адкрыты раней невядомы архітэктурны помнік XVI–XVIII стагоддзяў.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падчас экскурсіі наведвальнікі музея знаёмяцца і з апошнімі гаспадарамі Міра — князямі Святаполк-Мірскімі. Даведваюцца, што першы ўладар Міра з гэтага роду Мікалай Іванавіч Святаполк-Мірскі збудаваў непадалёку ад замка двухпавярховы палац, дзе з камфортам магла размясціцца яго сям'я. Так склалася, што век палаца быў нядоўгім: ён згарэў у 1917 г., а яго рэшткі былі разабраныя на цэглу ў сярэдзіне XX ст. Са стварэннем музея ўчастак, на якім стаяў палац, быў уключаны ў тэрыторыю замкавага комплексу. Навуковыя супрацоўнікі музея адшукалі архіўныя дакументы, якія праліваюць святло не толькі на жыццё сям'і Святаполк-Мірскіх, але і на працэс будаўніцтва іх рэзідэнцыі, таму з'явілася ідэя ачысціць руіны палаца і ўключыць іх у экскурсійныя маршруты. Вясной 2016 г. кіраўніцтва Музея "Замкавы комплекс "Мір" звярнулася ў Інстытут гісторыі з прапановай правесці археалагічныя працы на месцы, дзе знаходзіўся палац князёў Святаполк-Мірскіх. Меркавалася, што працы будуць выкананыя за некалькі тыдняў, аднак нас чакалі вялікія сюрпрызы, і банальная расчыстка руінаў канца XIX ст. перарасла ў грунтоўныя і маштабныя археалагічныя даследаванні.

Рэзідэнцыя Святаполк-Мірскіх размяшчалася за ставам на ўзгорку на паўднёвы ўсход ад Мірскага замка. Як мяркуецца, тут знаходзіўся замкавы фальварак, а паміж ім і замкам размяшчаліся сад і агароды. З паўднёвага боку быў узведзены двухпавярховы флігель, у якім і цяпер жывуць людзі. Рэшткі палаца былі засыпаныя смеццем і зямлёй. На гэтым месцы выраслі дрэвы, а жыхары былога флігеля разбілі свае агароды і паставілі гаспадарчыя пабудовы. Спачатку на месцы, дзе стаяў палац, быў закладзены раскоп на 440 $м^2$, аднак на трэці сезон плошча даследаванняў вырасла да амаль 800 $м^2$.

Ужо праз тыдзень правядзення раскопак высветлілася, што пад слоем развалу знаходзіліся рэшткі больш ранняга мураванага будынка. Падмуркі і рэшткі сцен, што захаваліся на вышыню да 1 м, былі зачышчаныя. Вывучэнне археалагічных знаходак, будаўнічых матэрыялаў і будаўнічай тэхнікі паказала, што намі выяўленыя рэшткі жылога дома, узведзенага ў канцы XVI — пачатку XVII ст. Яго падмуркі складзеныя з шэрагаў камянёў (некаторыя з іх падчасаныя), асобных цаглін і іх кавалкаў, акуратна ўкладзеных паміж валунамі. Кожны шэраг пралівалі вапнавай рошчынай



**ГАНЕЦКАЯ Ірына Уладзіміраўна.**

*Кандыдат гістарычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Нарадзілася ў г. Маладзечна. У 1984 г. закончыла гістарычны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута, у 1989 г. — аспірантуру Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Аўтар манаграфій "Маёліка на Беларусі ў XI–XVIII стст." (Мн., 1995), "Глускі замак у святле археалагічных даследаванняў і пісьмовых крыніц" (Мн., 2018), больш за 100 навуковых артыкулаў. Навуковы рэдактар IV тома "Археалогіі Беларусі" (Мн., 2001) (разам з В.М.Ляўко і Ю.А.Заяцам). Займаецца археалогіяй перыяду XI–XVIII стст. (горад, замак, помнікі архітэктуры, керамічныя вырабы), гісторыяй культуры XI–XIII стст.*